*Аліна Ваўранюк*

# ЛЕМАНТАР

## Падручнік па беларускай мове для 2 класа

Мастацкае афармленне

*Міраслаў Здрайкоўскі*

LEMANTAR

Podręcznik do nauki języka białoruskiego

dla kl. 2 szkoły podstawowej

Opracowała

Alina Wawrzeniuk

Okładka, ilustracje

Mirosław Zdrajkowski

Redaktor techniczny

Adam Pawłowski

Podręcznik dopuszczony do użytku szkolnego przez ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania i wpisany do wykazu podręczników przeznaczonych do kształcenia ogólnego dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym do nauczania języka białoruskiego na poziomie klasy II szkoły podstawowej na podstawie opinii rzeczoznawców dr Teresy Chylak-Schroeder i prof.dr. hab. Mieczysława Jackiewicza.

Numer ewidencyjny 634/2/2013. Rok dopuszczenia 2013.

Podręcznik jest finansowany przez Ministerstwo Edukacji Narodowej.

ISBN 978-83-934208-2-7

© Copyright by Stowarzyszenie „AB-BA”

Białystok 2013

STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI

I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA”

15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8

www.ab-ba.com.pl

Wydanie pierwsze

Drukarnia

Aušra

ul. Mickiewicza 49, 16-515 Puńsk




Добры дзень, мой браце юны!
Я прынёс табе як дар
Ад Скарыны-бацькі кнігу –
Беларускі лемантар.

Гэта – ключ ад скарбаў нашай
Мовы матчынай, з якой
Ты не станешся самотнай,
Безыменнай сіратой.

Дык раскрый яго з любоўю –
Літар стройныя рады
Прачытай і паўтары іх,
І запомні назаўжды.

*М. Танк*

# Давайце знаёміцца

Я – Алесь, а ты – Марынка,
Хлопчык я, а ты дзяўчынка.
Раз – два – тры – чатыры – пяць.
Як цябе зваць?

*Т. Шылько*

Каго бачыш на рысунках? Назаві гукі і пазнач іх чырвоным (галосны гук) і сінім (зычны гук) колерамі.



Раз – два – тры – чатыры – пяць,
Бавім час мы не дарма.
Просім хуценька назваць
Сваё прозвішча, імя.

*Т. Шылько*

# Дарога ў школу

Штохвіліны на шашы
Шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
Шорах,
Шум птушыны.
За машынаю машына.

Нешта шэпча
Шына шыне.
Шпак шыкуе
На шыпшыне...
Шэпча шустрая шаша:
— Не спяшайцеся, ша-ша...

*Р. Барадулін*

Што бачыш на рысунках? Назаві гукі і пазнач іх чырвоным (галосны гук) і сінім (зычны гук) колерамі.











# Наш клас

Нам сем гадоў і ўсе мы вясёлы
Нам сем гадоў і ходзім мы ў школу.
Хіба кожны бачыць, што вучні тут стаяць?
Мы любім вучыцца, гуляць і спяваць!

*А. Ваўранюк*




Што бачыш на рысунках? Назаві гукі і пазнач іх чырвоным (галосны гук) і сінім (зычны гук) колерамі.













# а А

Ала
Аднойчы
Алеяй ішла.
Ала
Арэшнік
У парку знайшла.
Ала адразу:
— Ах,
Асалода! —
Ам, ам арэшкі.
З’ела!
А шкода!

*А. Ваўранюк*





Над новаю хатай пастаўлены кроквы:
Дзве жэрдкі вуглом і між імі адна.
Прыгледзьцеся добра, і нават здалёк вы
Адразу пазнаеце літару **А**.

*А. Вольскі*



Запішы малую
і вялікую літары.

а

А

а

А

Што бачыш на рысунках? Назаві гукі і пазнач іх чырвоным (галосныя гукі) і сінім (зычныя гукі) колерамі.









у У



Устаў удод уранні,

Прыбраў сваё дупло,

І твар памыў у ванне,

І кожнае крыло.

*С. Сокалаў-Воюш*

Закончы ўзоры.



Запішы малую і вялікую літары.

у

У

у

У

о О



Арол героем стаў —
У Афрыку лятаў.
Якую ўзнагароду
Арлінаму даць роду?

*К. Камейша*

Не стогне **О**, не вохкае,
Прыгожае і лёгкае,
Качаецца яно
Са слова ў слова:
Ван-др**о**ў-нік, с**о**м, ак-н**о**.
А-г**о**нь, дуб-р**о**-ва.
І ў слове д**о**м знайшло
прыпынак,
Падобна **О** на абаранак,
На сонейка ў блакіце.
На што яшчэ, скажыце?

*Р. Барадулін*

Запішы малую
і вялікую літары.

о

О

о

О

Што бачыш на рысунках? Назаві гукі і пазнач іх чырвоным (галосныя гукі) і сінім (зычныя гукі) колерамі.











# і І

Я любімай
Ляльцы
Села шыць
Абноўкі.
І колюць пальцы
Вострыя іголкі.
Ад паўдня
Шчырую,
Шыю бант,
Спаднічкі,
З люрэксу
Майструю
Цуда-чаравічкі.
Памагае мама
Дый смяецца
Ціха:
— Можа, мне
Таксама
Сшыеш што,
Майстрыха?



*У. Мацвеенка*

Запішы малую
і вялікую літары.

*і*

*І*

*і*

*І*

Размалюй Іне торт
на імяніны.

Іна рада – імяніны.
«І» на торце – імя Іны.
І мяне торт не міне —
Імяніны і ў мяне!

*з часопіса
«Вясёлка»*



# э Э



Мама любіць тэлевізар,
тата любіць тэлевізар,
брацік любіць...
Ён, бывае,
ажно ў крэсле засынае.
Во сакрэт неразгаданы:
што іх цягне да экрана?
Кожны з іх
з экранам зліты —
можа, той экран магнітны?

*М. Дукса*

Э – як месяц – маладзік,
Носік мае, нібы цвік.

*У. Ягоўдзік*



Запішы малую
і вялікую літары.

э

Э

э

Э

Вывучы
верш
на памяць.

Энікі-бэнікі з'елі варэнікі,
Бобу гаршчэчак і цэбар катлет,
Рэшата, грэчку, патэльню, амлет,
Шэрую тэчку з паперамі таты,
Бэлькі і жэрдкі для новае хаты,
Рэха лясное, дубовыя венікі,
З'елі і лопнулі... энікі-бэнікі!

*С. Сокалаў-Воюш*

Што бачыш на рысунках? Назаві гукі
і пазнач іх чырвоным (галосны гук)
і сінім (зычны гук) колерамі.







Як выглядаюць Энікі – бэнікі?
Нарысуй іх.



# Ы



Ёсць літары у буквары,
З якіх не пачнеш ты слова.
Але запомніце, сябры,
Вы іх абавязкова.



— Каб не было на свеце **ы**, —
Сказалі хорам мышкі, —
Былі б мядзведзямі ўсе мы,
Нас дзеці звалі б мішкі.

*В. Вітка*



Запішы літары.

ы

ы

Што бачыш на рысунках? Назаві гукі
і пазнач іх чырвоным (галосны гук)
і сінім (зычны гук) колерамі.













Што бачыш на малюнках?
Назаві і лічы. Размалюй рысункі.



н Н



Чаму не спіш ты,
Мой малыш,
Калі кругом усе паснулі?
Ты ўсё крычыш,
Не замаўчыш,
Спаць не даеш сваёй матулі.
Чаму не спіш ты,
Мой малыш?
Заснуў даўно твой мілы коцік,
Заснула мыш
І спіць гладыш
На задрамаўшым старым плоце.
Чаму не спіш ты,
Мой малыш?
Заплюшч урэшце свае вочы.
Хай прыйдзе сон
З усіх старон
І цішыня прыгожай ночы.

*В. Швед*

Запішы малую
і вялікую літары.

н

Н

н

Н

Запішы
спалучэнні
літар.

на

нэ

ну

ны

Што
ў кошыках?





Прачытай сказы.

У Ніны  .

У Іны  .

- На, Іна  .

- На, Ніна  .

Ну і Ніна. Ну і Іна.

Запішы сказы.

Ну і Ніна. Ну і Іна.

Вывучы верш на памяць.

Нельга ныць -
Адно засвой.
І ляноце і мане
Ты скажы рашуча - не!

*Р. Барадулін*

# м М



Сонца глянула
З-за хаты —
Усміхнуўся мак
лупаты.
Сіні лён
І васілёк
Усміхаюцца
Здалёк.

З невысокае
Травінкі
Заўсміхаліся
Расінкі.
Зайчык сонечны
З аконца
Прывітаў усмешкай
Сонца...

Як даведацца,
Чаму
Ўсе ўсміхаюцца
Яму?

*Л. Шырын*

Запішы малую
і вялікую літары.

м

М

м

М



У якіх словах
чуеш гук м?

Запішы
спалучэнні
літар.

мэ

ум

ім

ым

Прачытай сказы.



Мы і мама.

У мамы Ніна і Іна.

У Іны  і 

У Ніны  і 

Запішы сказы.

Мы і мама.

У мамы Ніна і Іна.

Эх, якія трусікі!
Проста прыгажосць:
Чорненькія вусікі,
Беленькая поўсць.
Вочы зыркаватыя -
З сонечных зярнят,



А хвасты куртатыя,
Як у зайчанят.
Кожны пыскай мокраю
Падае мне знак -
Час займацца морквaю
Ці грызці бурак.

*М. Калачынскі*

Падобна **Т** на граблі
З двума апошнімі зубамі.
Астатнія – аслаблі,
І ўсе павыпадалі самі...

*М. Маляўка*



Запішы малую
і вялікую літары.

т

Т

т

Т

Запішы словы.

мэта

тэма

там

тама

Складзі
і запішы словы.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| А | Н | Т | А | Н | І | Н | А |
| | | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 3 | 4 | 3 | 4 | | |
| | | 1 | 2 | 5 | 4 | | |
| | | 6 | 7 | 8 | | | |
| | | 7 | 8 | 3 | 4 | | |

Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

# Тут мама, тата і Ната.
# А там Антон.
# У Антона ноты.



# х Х



Плыве па сінім небе шпарка.
Купчастая, сівая хмарка.
Унучак кажа: мілы дзеду
Ты пасадзі мяне, паеду.

Я, дзедка, з хмаркі гляну вокам
На навакольны свет шырокі
І раскажу табе багата
Вярнуўшыся ізноў дахаты.

*В. Швед*



**Х** – нажніцы ад знямогі
Выпрасталі рукі, ногі...

*Р. Барадулін*

Запішы малую
і вялікую літары.

х

Х

х

Х



— Калі моцна захачу,
кошку гаўкаць навучу.
А яшчэ як захачу —
пераскочу каланчу.
Захачу – і палячу.
Зоркі ў небе палічу.
— Паспрабуй жа паляцець!
— Расхацелася хацець...

*А. Касько*

Вывучы верш
на памяць.

З літар-дажджынак складзі і запішы словы.




Прачытай сказы і старанна іх запішы.



Тут хата Наты.
Хто там? Там мама.
Хто тут? Тут муха.

# ш Ш



У мяне ёсць шарык –
Жоўты, як ліхтарык.

На яго з усіх бакоў
Шмат сядае матылькоў.

Хочуць сесці на мой шарык
Пчолка, муха і камарык.

Сяду на яго сама...
Бах! – і шарыка няма.

*А. Хадановіч*

Запішы малую
і вялікую літары.

ш

Ш

ш

Ш

Што бачыш на малюнках?
Назаві гукі, пазнач іх колерамі.









Вывучы
верш
на памяць.

Зіма не страшна Аліку:
У шапцы ён і шаліку,
У вязаных штанах,
Шкарпэтках на нагах.

*Т. Шылько*

Запішы словы.

шум

мушу

мыш

нашу



Прачытай сказы
і старанна іх запішы.



# У Наташы машына.
# У Мішы шахматы.
# Там шум. Там мыш!

Вывучы песню.

Зубная шчотка Веранічкі
Танцуе ўвечары факстрот
З кавалкам мыла невялічкім,
Худым і тонкім быццам дрот.
    Ой, ты шчотка зубасценькая,
    Шчотка-псотка выгімнасценькая.
Зубная шчотка Веранічкі
Марыць увесь наступны дзень,
Каб зноў сцягнуць яго з палічкі
І станцаваць яго на цень.
    Ой, ты шчотка зубасценькая...

*Л. Пранчак*





с С

Чые ноччу ў гушчары
Зіхацяць два ліхтары?
Хто ўсю ноч гагоча,
Спачываць не хоча?
Хто, пабачыўшы святло,
Хутчэй лезе у дупло?
Хто адкажа мне? Раз, два...
— Крывадзюбая сава!

*В.Вітка*

Запішы малую
і вялікую літары.

с

С

с

С

У якіх словах
чуеш гук С?



Складзі і запішы словы з літар:
у, а, х, м, ш, с, н,ы.

Складзі і запішы словы са складоў:
ма, му, на, ні, та, ха, са, шы.



Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

У таты соты. А там аса.
— Ох, тата, аса!
— Тата! У хату.
У хату і аса. У таты сіні нос.

лЛ

У малой дзяўчынкі
Лялька-балаўніца
Любіць і хусцінкі,
Любіць завушніцы.
Любіць яна ўранку
Паскакаць, скакуха!
Любіць калыханку
Вечарам паслухаць.
Любіць, хто на вушка
Песенку спявае...
Спі, мая дачушка,
Лялька засынае.

*А. Пісарык*





Я лячу, лячу на лыжах,
Лёгкі ветрык лоб мой ліжа.
Белы снег нібыта мел...
На трамплін падобна эл.

*А. Вольскі*

Запішы малую
і вялікую літары.

л

Л

л

Л

Мыла Міла мішку мылам,
Міла мыла упусціла.
Упусціла Міла мыла,
Мішку мылам не дамыла.

Міла мылам мыла мішку,
Ляльку брудную Ірышку.
Мыла-мыла мылам Міла,
З твараў цацак фарбу змыла.

*з часопіса «Вясёлка»*

Вывучы верш
на памяць.



У якіх словах чуеш гук **Л**?



Прачытай сказы і старанна іх запішы.

Тут стол.
На ім салата, масла і маліны.
Мама мыла і саліла салату.
Аліна мыла маліны.

# к К



Круглыя, як мячыкі,
Быццам адуванчыкі,
Па вадзе ля хаты
Ходзяць качаняты.

*А. Лойка*



Запішы малую
і вялікую літары.

к

К

к

К

Падпішы
рысункі.



| | | | |
|---|---|---|---|
| К | | | А |



| | | | |
|---|---|---|---|
| К | | | А |



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| К | | | | А |



| | | | |
|---|---|---|---|
| К | | | А |

Запішы словы.

клас

шкло

малако

лік

# р Р



Я прабіў палонку ў лёдзе –
Там празрыстая вада,
Ходзяць рыбы ў карагодзе,
Аж лавіць мне іх шкада.

Над вадой я нахіліўся,
Доўга з цудаў тых дзівіўся.
Зразумеў – пад Новы год
Водзяць рыбы карагод!

*Х. Жычка*



Запішы малую і вялікую літары.

р

Р

р

Р

Запішы словы.

літара

тры

крык

рука

Вывучы верш на памяць.

Кот прысеў на беражку,
Кінуў вуду у раку.
Шэпча небарака:
— Рэчка, рэчанька, рака,
Падары мне акунька.
Ша... штось клюнула.
Шчупак!?
Вуду выцягнуў рыбак.
Крыкнуў кот: — Здурэю, рак!

*Н. Сторажава*



Адкажы на пытанне.

Што –
Правер ты –
На градзе
З літараю “р”
Расце?
Пад разгалістым кропам
Разляглiся агуркі,
Ёсць радыс,
Пятрушка,
Морква,
Рэпа,
Рэдзька,
Буракі.
І гарох,
І памідоры,
Сельдэрэй,
І гарбузы,
І цыбуля,
І фасоля.
Што не так тут?
Адкажы.

*М. Пазнякоў*



Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

Наш Раман малы. Мама Рамана – Ларыса. У Рамана арэлі, у Тамары торт.

А там расліны і рака. Там тры трусы.



Вывучы песню.

Не стамлюся я спяваць: ра-ра-ра.
Я вучуся размаўляць: ры-ры-ры.
Хто не любіць сумаваць:
Будзе з намі паўтараць:

Я сяброўцы гавару: ру-ру-ру.
Верабей згубіў пяро: ро-ро-ро.
Гасне ясная зара: ра-ра-ра.
Цёмна стала на двары: ры-ры-ры.

Я сяброўцы гавару: ру-ру-ру.
Над ракой гарыць зара: ра-ра-ра.
Горла грач стары дзярэ: рэ-рэ-рэ.
Дрозд прачнуўся у бары: ры-ры-ры.

*Л. Пранчак*

# п П



**П**э падобна на вароты.
Пашукай хутчэй яго ты
Ў словах: пара, птах, пілот
І паветраны палёт.
Глядзіцца літара як брама,
Што высіцца ў двары,
І вы яе хутчэй таксама
Запомніце, сябры.
Знайшоўся раніцаю спеўнік –
І загарланіў звонка пеўнік.
З такім будзільнікам Пятрок
Ужо не спозніцца на ўрок,
Папоўніць слоў запас:
Пагоня, покуць, прас.
Пяцёрку потым, як і ўсе,
Пятрок дадому прынясе,
Пакліча на хвілінку маму
І ў буквары пакажа
Браму.

*М. Маляўка*

Запішы малую
і вялікую літары.

п

П

п

П

Запішы словы.

пішу

плакала

піла

Што бачыш
на малюнках? Падпішы.







Марта, Піліп, Раіса,
Аліна, Паліна, Алік,
Міша, Мікола, Караліна, Тамара,
Раман, Ніна, Шура, Сашка

Запішы імёны дзяцей з падзелам на склады.



Тут мост. А там парк.
Паліна і Піліп у парку.
Там таполі, асіны і ліпы.

Прачытай сказы і старанна іх запішы.

# в В



Вожык з-пад верасу выгнаў вужаку,
Лезе вужака на дрэва ад жаху.
Вокал ствала, як вяроўка, скруцілася.
Гэтак і **В**э, відавочна, з’явілася.

*А. Вольскі*



Запішы малую
і вялікую літары.

в

В

в

В

Запішы
словы.

Віктар

„Ніва"

вокны

слова

вусы



Вывучы
верш
на памяць.

Ты, Вадзім,
Не глядзі,
Як ляцяць вароны,
А вады набяры
Ды палі вазоны.

*В. Жуковіч*

Прачытай сказы і запішы іх па памяці.

У Васі слівы.
У Вікі аловак.
Віка рысавала і пісала словы.

Дапамажы Віцы выканаць рысункі да слоў.




вока

вусы

аловак

сліва

вусны

вокны

З з



Падобна літара на тры –
Адзнаку ў дзённіку і сшытку,
Яе вы знойдзеце, сябры,
У залатым, як сонца, злітку.
Без гэтай літары збанок
Паб'ецца, быццам незнарок,
І не пакліча вас на ўрок
Без гэтай літары званок.
Адразу дзве, каб не худзець,
Узяў запаслівы мядзведзь,
Другія літары грымяць,
Гудуць, хрыпяць, шыпяць,
І толькі Зэ адна
Звініць,
Як тонкая струна.
Скажыце, ці знайшлося
Ёй месца ў імі Зося?



*М. Маляўка*

Запішы малую і вялікую літары.

з З

з З

Што бачыш на малюнку?



Вывучы верш на памяць.

Завіруха завяла
Песеньку зімовую,
Скрозь узгоркі замяла
Белаю абноваю.
За каўнер, назола, лезе
І выводзіць **З** на снезе.

*А. Вольскі*

Прачытай і запішы.

За акном зіма. Узімку вакол прыгожа. Маразы закавалі раку. А на вокнах узоры: зоркі, лісты, кусты.

Ну, і мастак мароз!

Размалюй акно як малюе яго мароз.



# ж Ж



Калі паслухаць хлапчука,
То **жэ** падобна на жука:
Убок расставіў лапкі-ножкі,
Каб адпачыць спакойна трошкі.
Калі паслухаем дзяўчынку,
То **жэ** падобна на сняжынку:
Упала на далонь яе
І ззяе так,
Не растае.
Без гэтай літары ў траве
Заблудзіцца сцяжынка.
І, стаўшы кропелькай, сплыве
Крыштальная сняжынка.
Сябры не зводзяць з **жэ** вачэй,
І ты запомні **жэ** хутчэй.

*М. Маляўка*



Запішы малую
і вялікую літары.

ж

Ж

ж

Ж

Запішы
словы.

жук

жмуркі

ажыны

кажу

Жэнік

Вывучы верш
на памяць.

Колькі ножак, столькі ж рук,
**Ж** – нібы вялікі жук.
Згубіш **Ж** – і слоў прыгожых
Прачытаць ніяк не зможаш...

*А. Вольскі*



Складзі
і запішы словы.

та жа ву ру жу

жы жы лы на

Прачытай
сказы і запішы.

Мама мышка сушыла шышкі.
Мышка – малышка мыла лыжкі.
– Высахлі шышкі – кажа мышка.
– Памыты лыжкі – кажа малышка.





# Й

Да палкі прыбілі яшчэ адну палку,
Але не спалохалі чорную галку.
Яна і цяпер не хаваецца ўсё-ткі.
Ды стала тут **І** называцца кароткім.
У словах: чайка, май, трамвай
Кароткіх **Й** не забывай.

*А. Вольскі*



**Й** просяць:
— Слова пачынай.
Аднекваецца:
— Ай, няхай.
Ніхто мяне не абміне,
Хоць стану ў самы край,
Бо як жа будуць без мяне
Гай, каравай, грай, рай?

*Р. Барадулін*



Запішы літары.

*Й*

*й*

Запішы словы.

*мой*

*май*

*край*

*тройка*

Прачытай сказы і старанна іх запішы.

Рашай урокі! Мый рукі! Хавай сшыткі і кніжкі! Паважай старэйшых! Шануй свой пакой!



Вавёрка села на пяньку –
Рада светламу дзяньку.
Распушыла хвост,
                    ды так:
Не вавёрка –
Мяккі знак!

*Я. Тарлапан*

З ім напішаш і агонь,
І далонь, і пень, і лінь.
Стане конам добры конь,
Толькі мяккі знак адкінь.

*А. Вольскі*

Запішы літары.

ь

ь

Прачытай словы.

стол – столь
тон – тонь
мол – моль

кон – конь
колкі – колькі
рыс – рысь



Складзі вусна сказы з гэтымі словамі.

Запішы словы.

канькі
матылькі
школьнік
толькі
соль

Чым займаюцца дзеці?



Школьнікі пайшлі на каток.
У Ані, Каські і Натальки санкі.
У Колі і Віктара канькі.
У Міхаські лыжы.

Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

# е Е



**Е** – тапырыць тры зубцы,
Нібы ў шчарбатым грабянцы.
Ды без **Е**, як зрікне дзесьці,
Не напішаш – ехаць, есці.

*А. Вольскі*

Запішы малую і вялікую літары.

*е*

*Е*

*е*

*Е*

Складзі са складоў словы і запішы іх.

ра ел но се кі на

Прачытай сказы і запішы.

Мама Лены ветэрынар. Тата Каські электрык. Мама Веркі інжынер. Тата Эмількі механік.

Адкажы на пытанні:
Хто твая мама?
Хто твой тата?





Прачытай сказы і запішы.

Мы ехалі праз ельнік. У лесе возера. Там карпы, карасі і акуні. Мы іх лавілі.

Адкажы на пытанні.

Кудою ехалі?
Што пабачылі ў лесе?
Хто жыве ў возеры?

# б Б

Мой баран,
Баранок,
Моцны, доўгі
Лабок,
Рожкі вострыя,
Як пікі,
Сам калматы,
Невялікі.
Шэрстка – воўна
Мяккая,
Баранок мой
Бякае.
Бякае
Бялюсенькі.
Сам яшчэ малюсенькі.

*А. Дзеружынскі*



Запішы малую
і вялікую літары.

б

Б

б

Б

Падпішы рысункі.













Складзі вусна сказы з запісанымі словамі.



Прачытай сказы і запішы.

Бабка купіла мне барабан. Усе білі па ім: бум-бум, бам-бам! Зрабілі сабе баль.

Вывучы верш на памяць.

Без літары **Б**
Не скажаш, каб бульбы
Зварыла бабуля.
На ўрок не разбудзіць
Будзільнік цябе
Без літары **Б**.



*з часопіса «Вясёлка»*

# д Д



Распусціўшы сучча
У глухім прыволлі,
Сам адзін расце ён
На далёкім полі.

Як цар у кароне,
Аб нічым не дбае,
Ці то стогне бура,
Ці віхор гуляе.

На адным ён месцы
Днюе і начуе;
Многа казак знае,
Многа песень чуе.

Дождж падмыў карэнне;
Ў ім дупло – як хата...
Ён стаіць і дрэмле –
Грозны, расахаты.

*Янка Купала*

Запішы малую
і вялікую літары.

д

Д

д

Д

Адкажы на пытанні.





Хто жыве ў дупле?
Хто жыве ў будцы?
Хто жыве ў клетцы?
А дзе ты жывеш?

Вывучы верш
на памяць.



Малады Данік домік зрабіў.
Дошчачку-дах акуратна прыбіў.
Домік на дрэва падняў, дзе сукі...
Дык прылятайце, шпакі-дружбакі!

*А. Дзеружынскі*



Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

За домам сад. Там раслі слівы. Ліда і Ніна здымалі слівы. Добры кошык назбіралі. Былі вельмі рады. Вось вам падарунак!

# г Г

Жывуць у лесе гномікі,
У лесе гномаў сем,
Яны ў зялёным доміку
Жывуць сумесна ўсе.
У кожнага з іх ложачак,
Сем крэселак у іх,
Сем місачак, сем лыжачак
Аздобленых, разных.

Гномікі, гномікі
Дружбу берагуць –
У зялёным доміку
Сто гадоў жывуць.

Яны ўсе дужа здатныя,
Сапраўдныя майстры:
І кавалі выдатныя,
Шаўцы і цесляры;
Яшчэ яны адметныя
Музыкі й мастакі;
І процьму казак ведаюць,
Бо кожны – памяткі.



Усе яны няўтомныя
Ля плуга і пліты.
Галоўнае, што ў гномікаў
Характар залаты:
Не лаюцца, не сварацца –
Жартуюць і пяюць.
Таму ім добра марыцца,
Што хараша жывуць.

*В. Жуковіч*

Запішы малую
і вялікую літары.

г

Г

г

Г

Запішы
словы.

гусь, гліна, снегіры, газета,
гэта, герой, нельга, гульня

Адгадай загадкі.

У яго адны турботы:
Адвільнуць як ад работы.
Беспрабудна суткі спіць,
Ды яшчэ пра гэта сніць.

*У. Паўлаў*

І дзень ідзе,
І ноч ідзе,
І трэці дзень, і сёмы.
Сваёй хадзе
Падлік вядзе,

Не ведаючы стомы.
І не стамляецца таму
(Хоць гулка сэрца б’ецца),
Што колькі б год ні йсці яму –
Ён з месца не скранецца.

*Н. Гілевіч*

То таўсцее, то худзее,
На калене плача,
А хто чуе - не бядуе:
Весяліцца, скача.

*Н. Гілевіч*

Ён і стукае, ён і грукае,
Здаецца, не для забаў,
Ды ні бараны, ні плуга
Ні разу не змайстраваў.

*У. Карызна*

Гэта так, ці мне здалося?
Вунь гарбуз на тонкай восі,
А на ім намаляваны
Горы, рэкі, акіяны.

*У. Мацвеенка*

Прачытай сказы і старанна іх запішы.

## Ігар і Генік зрабілі снегавіка.

## Мама Ганкі купіла хустку.

## Ганна купіла агуркі.





Хто зрабіў снегавіка?
Хто купіў хустку?
Што купіла мама Ганкі?
Хто купіў агуркі?
Што купіла Ганна?

Адкажы вусна на пытанні.

Прачытай сказы і запішы.



Ішла Галіна па лузе. Раптам гусі! Напалохалі Галінку. — На, Галінка, галінку! Прагані гусей!

Вывучы верш на памяць.



**Г**э гучыць заўсёды глуха:
Гаць, гарбуз, гарлач, галіна,
Гол, гара, гагара, гліна.
Не забудзьце ж і наконт
Словаў тых,
Дзе **Г**э званчэе:
Ганак, гузік, розгі, гонт.

*Р. Барадулін*

я Я



Залацісты, спелы яблык
на маёй ляжыць далоні.
Залацісты, буйны яблык,
быццам сонейка малое.

Быццам сонейка малое,
нават горача далоні.
Досыць чуць яго пацiснуць,
і – у твар праменні пырснуць.

*І. Муравейка*

Запішы малую
і вялікую літары.

я

Я

я

Я

Запішы словы.

пляма, сляза, пясок,
змяя, яны, мяне

Вывучы верш
на памяць.

**Я** выходзіць на дарожку,
Горда выставіла ножку.
Нібы мяч надзьмула грудзі.
Выхваляцца, пэўна, будзе.

*А. Вольскі*





Прачытай сказы.

У пахмурным небе снегавыя хмары апускаліся нізка-нізка. Хмары складаліся з мноства сняжынак. Яны сябравалі. Тут, у небе, ім было лепей. І вось белым дываном накрылі яны наваколле. Жылі сняжынкі зіму. А калі прыйшла вясна, яны расталі, сталі кропелькамі вады.

# Ч Ч

Цераз бор, што ў ззянні медзі,
На машыне зайчык едзе.
Едзе, песеньку спявае,
Чарапаху даганяе.
- Лезь, маруда, на машыну,
То да горада падкіну.
- Лезці часу я не маю -
Вельмі ж на базар спяшаю.

*В. Гардзей*



Запішы малую
і вялікую літары.

ч

Ч

ч

Ч

Падпішы рысункі.



















Прачытай і запішы.

Добры вечар.

Да пабачэння.

Прабач, калі ласка.



Прачытай сказы.

Зімой мама прывезла мяне да бабулі. Мне было самой сумна, я не ведала там нікога. Аднойчы да нас зайшлі хлопчыкі. Яны паклікалі мяне на рэчку. Хутка мы былі каля заснежанай ракі. Наш бераг высокі і круты, а другі – нізкі. Мы каталіся на санках, а побач нас бегалі сабакі.

Усім было весела!





У кароткае
Ні разу
Не было
Ў пачатку сказа,
Яно гук
Кароткі мае,
Коску
На плячах трымае.
Спадзявацца я магу,
Што запомніш гэта **ў.**

*У. Мацвеенка*





Запішы літару.

Ў

ў

Прачытай і запішы згодна з узорам.

піла – піў

ліла

пісала

была

мыла

купіла

жыла

гуляла

варыла

спявала

плавала

чытала

малявала

даглядала

Оў оў-оў – назбіраў грыбоў.
ыў-ыў-ыў – потым насушыў.
Аў-аў-аў – суп прыгатаваў.
Оў-оў-оў – частаваў сяброў.

*з часопіса «Вясёлка»*

Вывучы верш на памяць.



Прачытай сказы.

Ішоў Міхаська берагам рэчкі. Над лугам чуўся гул. Гулі пчолы і камары. Міхась заслухаўся, маўчаў. Можа, як і рыбка, голасу не мае?



# ц Ц



На стале, на дне талеркі
Заспрачаліся цукеркі,
Хто з іх лепей і чаму,
І каму найперш хлапчынка –
Неўгамончык-малайчынка –
Скажа:
– Я цябе вазьму!
Скажа:
Я цябе люблю!
Бо нідзе на свеце лепшай
Не знайду і не куплю!
А хлапчынка-малайчынка
Падабраўся пакрысе
Цоп – і ў рот!
І з’еў усе!

*С. Сокалаў-Воюш*

Запішы малую
і вялікую літары.

ц

Ц

ц

Ц

Запішы.

Смачна есці!

Смачна снедаць!

Смачна абедаць!

Смачна вячэраць!

Вывучы верш
на памяць.



На маёй руцэ пяць пальцаў,
Пяць трымальцаў, пяць хапальцаў.
Каб насіць да рота лыжку,
Каб альбом гартаць і кніжку,
Кабстругаць і пілаваць,
Каб лічыць і маляваць.

*Н. Сторажава*

Прачытай сказы
і старанна іх запішы.

У нас шмат цацак.
Мы часта сустракаемся і супольна гуляем.
Цікава бавім час. Гуляем у хаце і на вуліцы.

Нарысуй сваю любімую цацку.

Розныя дзеці
жывуць на планеце –
белыя,
жоўтыя,
чорныя дзеці.



Розныя дзеці –
аднолькавы смех.
Смех у хвіліны
забаў і пацех.

Розныя дзеці –
і розныя вочы.
Вочы – як неба.
Вочы – як ночы.

Вочы, як мора
ўвабралі глыбіні,
вочы – пад колер
бязводнай пустыні.

Розныя вочы – адзіныя
слёзы
Слёзы ў хвіліны
бяды ці пагрозы.

Вось бы зрабіць,
каб на нашай планеце
гора не ведалі
розныя дзеці.

Вось бы зрабіць,
каб у розных дзяцей
радасць гасціла
даўжэй
і часцей.

*А. Вольскі*

Запішы малую
і вялікую літары.

дз

Дз

дз

Дз

Запішы.

Добры дзень. Добры вечар.
Дабранач. Шчырае дзякуй.

Вывучы верш
на памяць.



Век дзяліся тым, што маеш, -
Хлебам-соллю, казкай-краскай.
Ну а ў госці запрашаеш,
Гавары ўсім:
- Калі ласка!
А з табой як тое будзе,
То за шчодры знак усякі
Пакланіся добрым людзям
І скажы ім шчыра :
- Дзякуй!

*У. Паўлаў*



Елка ў ельніку жыла,
Елка ў ельніку расла.
Елку везлі нам на свята
Белы зайка і жаўна.
Як прывезлі елку ў хату –
Стала ёлачкай яна.

*С. Сокалаў-Воюш*



Запішы малую
і вялікую літары.

ё

Ё

ё

Ё

Прачытай
сказы.




Усе доўга чакалі надыходу вясны. Надаеў ім снег, лёд і мароз. Нарэшце прыйшоў цёплы дзянёк. Сёння Алёнка з цёцяй паехалі на вёску. Па зялёных галінках клёну скача вавёрка. Над лугам лётае матылёк. Пчолкі кружаць над веснавымі кветкамі, каб мы маглі есці мёд. Ён і смачны, і здаровы.

# ю Ю

Рыбакі ў нядзелю
Юшку ў Юлі елі:
Юрась і Ясь,
Юльян і Стась,
Юстын і Адась,
Юзік і Максім, -
Юшкі той
Хапіла ўсім.
- Юля, нам згатуеш зноў
Юшку з уюноў?

*М. Чарняўскі*



Запішы малую
і вялікую літары.

ю

Ю

ю

Ю

Прачытай і запішы.

Юлька прыгожа спявае.
Юрка купіў цікавую кніжку.
Юля ганяе мячык.
У нашай бабулі юбілей.
Людзі любяць весяліцца.



Дапоўні сказы.

Ты спяваеш, і я ........................................ .

Ты бегаеш, і я ...................................................... .

Ты рысуеш, і я ..................................................................... .

Ты гуляеш, і я ...................................................................... .

Ты малюеш, і я .................................................................... .

Ты думаеш, і я ....................................................................... .

Складзі і запішы сказы са словамі: спяваю, чытаю, мыю, малюю.

Вывучы верш на памяць.

Люты, люты,
Не лютуй!
Вясну зелену
Ратуй!
Люты, люты,
Не марозь!
Вясну зелену
Прывозь.

*З народнага*



# ф Ф



Загадка не з лёгкіх:
якія – гадайце –
любімыя колеры
ў Ніны на парце?

– Напэўна чырвоны,
прыгожы ён дужа,
ты ім расфарбуеш
і макі, і ружы.

– Ды не, не чырвоны.
– Ну, сіні, быць можа?
Ён колеру неба,
ён надта прыгожы!

– Аднак жа не сіні.
– Дык, пэўна зялёны,
ён колеру лугу,
і мора, і клёна.

– Зноў кепска, не гэты.
– Ці жоўты найлепшы?
Ён сонцам нас грэе,
і лашчыць, і песціць.

Доўга яшчэ фарбы мы называлі,
якая найлепшая, не адгадалі.
Нарэшце нам Ніна сама праявіла,
усе колеры свету яна палюбіла.

*Паводле В. Жуковіча*

Запішы малую
і вялікую літары.

ф Ф

ф
Ф

Запішы словы.

фарбы
фікус
Франак
футбол



Вывучы верш
на памяць.

Певень з седала саскочыў:
– Працірайце, куры, вочы!
Куранят будзі, квактуха!
На дварэ сягоння суха,
Выбягайце па парадку –
Пачынаем фіззарадку!

*М. Хамянкоў*

Размалюй палітру колерамі: чырвоным, сінім, жоўтым, зялёным, шэрым, чорным, ружовым, карычневым.



Складзі
і запішы словы.



# дж ДЖ



Не з казкі, а з загадкі
Прыбеглі зайчаняткі
І клічуць нас:
За стол хадзем.
– А што ў вас ёсць?
– Вішнёвы джэм!

*М. Маляўка*



Запішы малую і вялікую літары.

*дж*

*Дж*

*дж*

*Дж*

Складзі і запішы сказы з гэтымі словамі.

*дождж* *хаджу*
*джэм* *джала*

Вывучы верш на памяць.



Джыганула штосьці Нінку –
Бо асу ўзяла за спінку.
Нінка, пэўна, і не знала,
Што кусака мае джала.

*У. Мацвеенка*

# апостраф

’



Вось апостраф. Гэта знак.
Вельмі важны ён, аднак.
З’езд, пад’езд – напішам проста,
Калі ўспомнім пра апостраф.

*А. Вольскі*

Як разложысты бераг ці востраў
Нецярплівы праліў раздзяляе,
Гукі так раздзяляе апостраф –
Кропля з хвастом дажджавая.

*Р. Барадулін*

Прачытай сказы і запішы.

Мы п'ём гарачую гарбату.
Гучна б'е гадзіннік у нашай хаце.
Машына стаіць ля пад'езда.
Вераб'і селі на дрэве.
Дзяўчаты пішуць аб'яву.

Зрабі рысунак, да аднаго са сказаў.

Праз каго ў нас цэлы вечар
не сціхае шум і гам?
Хто цягае з шафы рэчы
і кідае тут і там?
Малады сабака Чапа,
мокры нос, чатыры лапы.
Чапа, Чапа, Чапа, Чапа
не бывае весялей.
Чапа, Чапа, Чапа, Чапа
працягні мне лапу.
Чапа, Чапа, Чапа, Чапа
лепшы сябра для дзяцей.
Як сняжок увесь ён белы
ад вушэй і да хваста.
Невялікі, але смелы,
не ўцякае ад ката.
Малады...
Адгадоўвае памалу
шэрсць кудлатую сваю
і пад вечар, вельмі ўдала,
дрэсіруе ўсю сям'ю.
Малады...

*Л. Сіманёнак*

Вывучы песню.





Сябры, пабраўшыся за рукі,
Вядуць усіх нас да навукі.
Яны – у кнізе, у газеце,
І іх павінны ведаць дзеці.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| А а | Б б | В в | Г г | Д д | Е е | Ё ё |
| *А а* | *Б б* | *В в* | *Г г* | *Д д* | *Е е* | *Ё ё* |
| Ж ж | З з | І і | й | К к | Л л | М м |
| *Ж ж* | *З з* | *І і* | *й* | *К к* | *Л л* | *М м* |
| Н н | О о | П п | Р р | С с | Т т | У у |
| *Н н* | *О о* | *П п* | *Р р* | *С с* | *Т т* | *У у* |
| ў | Ф ф | Х х | Ц ц | Ч ч | Ш ш | ы |
| *ў* | *Ф ф* | *Х х* | *Ц ц* | *Ч ч* | *Ш ш* | *ы* |
| ь | Э э | Ю ю | Я я | | | |
| *ь* | *Э э* | *Ю ю* | *Я я* | | | |

Прачытай назвы літар алфавіта.
Правільна іх вымаўляй.

а, бэ, вэ, гэ, дэ, е, ё, жэ, зэ, і, і нескладовае, ка, эл, эм, эн, о, пэ, эр, эс, тэ, у, у нескладовае, эф, ха, цэ, чэ, ша, ы, мяккі знак, э, ю, я



Запішы імёны дзяцей
у алфавітным парадку.

Кася, Лукаш, Адам, Юстына, Аня, Аляксандр, Міхась, Коля, Марыся, Бася, Ніна, Лідка, Ганка, Куба, Ігар, Мацвей, Тамара, Оля, Наталька, Марта, Дар’я, Грышка, Паўліна, Вікторыя, Эля, Паўлік, Віктар, Леў, Ніка, Максім, Валодзя, Сяргей

# КАЛЯДЫ



Пахне ў хаце святочнай ялінкай,
Пад абрус тата сенца прынёс.
Памаўчыце, о людзі, хвілінку –
Нарадзіўся Збавіцель Хрыстос!

Радасць, шчасце пануюць наўкола.
Ты зырчэй, мая свечка, палай!
Падарункі разносіць вясёлы
Дзед Мароз ці Святы Мікалай.

*Л. Кебіч*



Мароз на вокнах піша казку,
А людзі апранаюць маскі
І йдуць на двор калядаваць –
Усіх са святам віншаваць
Дарункі ім даюць за тое:
Сыры, каўбасы і напоі.

*С. Сокалаў-Воюш*

21. студзеня

# ДЗЕНЬ БАБУЛІ

Вывучы верш. Можаш праспяваць яго бабулі на мелодыю песні “Маруся, ты Маруся”.



Бабулечка, бабулька,
Люблю Твае я казкі.
Цішэю і святлею **х 2**
Ад слоў Тваіх і ласкі.

Мяне Ты называеш
Пяшчотнаю салоўкай.
А я Цябе, бабулька, **х 2**
Заву сваёй сяброўкай.

Табе дару я ружы,
Частую смачнай кавай.
Я вырасці жадаю **х 2**
Такой, як Ты, ласкавай.

Бабулечка, бабулька,
Павер, на ўсёй планеце
Дабрэй, чым Ты, – нікога **х 2**
Няма на цэлым свеце!

*Л. Пранчак*

1 – зялёны 2 – чырвоны 3 – жоўты
4– сіні 5 – аранжавы 6 – шэры
7 – карычневы

Размалюй рысунак.



# Бабуля

Вывучы верш на памяць.

Маміна мама –
Бабуля мая.
З ёю сябрую,
Маленькая, я.

Я ў бабулі
Ўнучка адна.
Унучку-чамучку
Шкадуе яна.

Добра з бабуляй.
Цікава заўжды.
Ніякай самоты,
Ніякай бяды!

Любіць бабулю
Ўся наша сям’я:
Матуля і тата,
Дзядуля і я.

*Л. Пранчак*



## 25. сакавіка

# ДЗЕНЬ ВОЛІ



Герб зямлі маёй – “Пагоня”:
Смелы рыцар на кані.
Ён нас славіць і бароніць
Год за годам, дзень пры дні.
Мы ж яму прыносім славу
Кожнай нашай добрай справай.

*С. Сокалаў-Воюш*



Тата мой трымае смела
Сцяг наш бел-чырвона-белы.
Трэба сіла для таго,
Каб як след трымаць яго.
Я ж... малую сілу маю
І – пакуль – сцяжок трымаю.

*С. Сокалаў-Воюш*

# ВЯЛІКДЗЕНЬ



Вясна шуміць, вясна гудзе,
Вялікдзень па зямлі ідзе.
Ліецца песня да нябёс:
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

Звініць званочкамі ручэй,
Заззялі сонейкі ў вачах.
За цёмны лес пабег мароз...
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

Зямля на сонцы грэе бок,
Чароўны белы галубок
Святую вестку нам прынёс:
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

Сыходзіць з твараў сумны цень,
Святочны час, святочны дзень,
Вясна, вясна – пара дзівос:
Хрыстос Васкрос! Хрыстос Васкрос!

*З часопіса «Вясёлка»*

# Рыхтуемся да велікоднага свята.

На Вербніцу ідзём у царкву.
Пячом мяса і пірагі.
Прыбіраем у хаце.
Фарбуем яйкі.



## 26. траўня (мая)

# ДЗЕНЬ МАМЫ



Маёй Маме з нагоды Свята
Я жадаю толькі добрых дзён багата:
Каб Яна не тужыла замнога,
Каб мінала Яе ўся трывога,
Каб хоць крышку магла пасмяяцца,
Каб за працу не мусіла брацца,
Каб у нядзелю магла адпачыць
І з сяброўкаю пагаварыць,
Каб Ёй грошай на ўсё хапала,
Каб ніякага гора не знала,
Каб ніколі Яна не хварэла,
Каб маршчынак на твары не мела,
Каб у хаце было Ёй прыемна,
Каб не плакала надарэмна...
Як усё гэта запамятаю,
Маёй Маме скажу, бо – КАХАЮ!

*Паводле М. Брыкчынскага*

1. чэрвеня

# ДЗЕНЬ ДЗІЦЯЦІ

З жоўтым кошыкам – то Жана,
а з аранжавым – Мар’яна.
Любіць грушы Луша наша,
любіць грушы і Наташа.
А вішнёвае варэнне,
ну, вядома, – аб’ядзенне.

*С. Шах*

Зрабі адпаведныя рысункі.

Наташа

Луша

Жанна

Мар’яна

Размалюй згодна з тэкстам.

У Віці чырвоная куртка. Ён апрануты ў белую кашулю, аранжавую камізэльку і сінія нагавіцы. Хлопец абуў карычневыя чаравікі. Оля ў жоўтай сукенцы і шапцы. Яна апранула зялёны плашч і чырвоныя калготы. У яе чорныя туфлі.



# ПОРЫ ГОДА

## ЗІМА



снежань,
студзень,
люты

## ВЯСНА



сакавік,
красавік,
травень
(май)

## ЛЕТА



чэрвень,
ліпень,
жнівень

## ВОСЕНЬ



верасень,
кастрычнік,
лістапад

# МЕСЯЦЫ

Вывучы песню.

Дванаццаць месяцаў – яскравы карагод,
Зімой на іртах езджу,
Вясной збіраю сок,
А летам спеюць яблыкі,
Вішнёвы п’ю кампот,
А восенню у кошыкі
Грыбы збірай дружок.
Давай згадаем яшчэ разок:
**Студзень** – студзіць,
**Люты** – лютуе,
**Сакавік** – пускае сок,
**Красавік** – лугі у красках,
**Травень** – кахае мяне мой дружок,
**Чэрвень** – чырвоная каліна,
**Ліпень** – ліпы зацвітаюць,
**Жнівень** – жыта дажынаюць,
**Верасень** – вецер з павуцінай,
А **кастрычнік** – кастры вакол,
Жоўты сад – **лістапад**,
**Снежань** – снег ляціць ізноў месяц да Каляд.

*Г. Шэмет*














# ТЫДЗЕНЬ




Вывучы верш на памяць.

Па нядзелі Панядзелак
Пачынае свой надзелак,
І няўрымслівы Аўторак
У рабоце не заморак.

Наперадзе чарада,
Пасяродку Серада,
Даў ёй слова напавер:
Выручыць сястру Чацвер.

Вясёлая Пятніца –
Заўсёды выдатніца,
А прайшла Субота –
Скончана работа.

Красуня Нядзеля
Абновы надзела.

*В. Вітка*

# Суткі гэта:

раніца



дзень



вечар



ноч



пазаўчора




учора




сёння




заўтра







паслязаўтра



# ВЕТЛІВЫЯ СЛОВЫ

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей
Раніцай: – Добрага ранку!
І апоўдні: – Добры дзень!

Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць: – Добры вечар!
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям: – Дабранач!

*В. Вітка*



Добрай раніцы!
Добры дзень!
Вітайце!
Заходзь, калі ласка!

– Як цябе завуць?
– Колькі табе гадоў?
– Дзе ты жывеш?





Прабачце,
калі што не так!

Дай мне, калі ласка!
Дзякую!



Прашу прабачэння!

Прабач мне!



Да пабачэння!
Бывай!
Бывайце!



Добрай ночы!
Дабранач!
Да сустрэчы!
Пакуль!

# СЯМ’Я і СВАЯКІ

тата

мама

дзядуля



сястра

бабуля

брат

## Мая сям’я

Мама і тата – мае бацькі.
Бабуля – мама маёй мамы і майго таты.
Дзядуля – бацька маёй мамы і майго таты.
Ніна – унучка бабулі і дзядулі.
Алік – унук бабулі і дзядулі.





Сястра мамы або таты гэта мая цёця.
Брат мамы або таты гэта мой дзядзька.



Гэта мае пляменнікі.

Вывучы верш на памяць.

Мама, тата,
Брат і я –
Наша дружная сям’я.
Дзве бабулі, два дзяды,
З імі разам – хоць куды!

*Т. Шылько*

# ЧАЛАВЕК


галава
шыя
рукі –
левая рука
рукі –
правая рука
ногі –
левая нага
ногі –
правая нага


лоб
бровы
шчочкі
рот
зубы
вочы
нос
вушы
губы

# САДАВІНА






яблык



груша



сліва



вішні



чарэшні

# АГАРОДНІНА


бульба


памідоры


агуркі


цыбуля


пятрушка


морква


перац


бурак


капуста


салата


часнок


радыска


зялёная цыбуля

# ПТУШКІ


дзяцел


ластаўкі


сава


снягір


галкі


вароны


галубы


шэрыя гусі


чайка


качкі


лебедзі

# КВЕТКІ



падснежнік



сон-трава



пралескі



анемон
(курапаткі)



лотаць



нарцыс



фіялкі



жоўты
нарцыс



незабудкі



маргарыткі



цюльпан



ландыш

# ВАКАЦЫІ



Палі, бары паклікалі –
Спявае дзетвара:
“Вакацыі, вакацыі –
Вясёлая пара!”

Расстанемся са школаю
Мы не на доўгі час,
Бо лагеры вясёлыя
Даўно чакаюць нас.

Там будзем днём
пагодлівым
Купацца, загараць,
З палеткаў краю
роднага
Гербарыі збіраць.

Каб з новымі навінамі
Сустрэць вучэбны год,
Лугамі і далінамі
Мы пойдзем у паход.

І радасна, і дружна мы
Час летні правядзём,
Бадзёрымі і дужымі
У школу зноў прыйдзём.

Палі, бары паклікалі –
Спявае дзетвара:
”Вакацыі, вакацыі –
Цудоўная пара!”

*А. Ставер*